**ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за май 2023 г.

## Мерапрыемствы да Дня Перамогі, Дня Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга РБ

**4 мая**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры для падапечных аддзялення дзённага знаходжання інвалідаў і грамадзян пажылога ўзросту Кобрынскага ТЦСАН прайшла літаратурна-музычная кампазіцыя «Было место песне на войне». Вядучыя расказалі аб цяжкіх днях Вялікай Айчыннай вайны, прагучалі вершы і песні ваенных гадоў.

ЦРБ, 61 чал.

**5 мая**

У філіяле «Дзіцячая бібліятэка» прайшло адкрытае пасяджэнне аматарскага клуба «Светач» - урок патрыятычнай кнігі «Чытаем, памятаем, ганарымся». Навучэнцам 7-ых класаў СШ №1 расказалі пра падзеі і памятныя даты Вялікай Айчыннай вайны, герояў, якія сваімі подзвігамі набліжалі доўгачаканы Дзень Перамогі. Рабятам прадстаўлены агляд мастацкіх твораў «Дарагая сэрцу кніга пра вайну».

Філіял «Дзіцячая бібліятэка», 35 чал.

**10 мая**

Музычна-паэтычны летапіс «Во имя Мира на Земле» прайшоў для навучэнцаў старэйшых класаў СШ № 1 г. Кобрына. Бібліятэкары расказалі школьнікам аб творчасці пісьменнікаў-франтавікоў. На мерапрыемстве гучалі вершы пісьменнікаў-франтавікоў П. Панчанкі, П. Броўкі, А. Куляшова, М. Джаліля, Ю. Друнінай, К. Сіманава, прагледжаны відэафрагменты аб бітвах у Вялікай Айчыннай вайне.

ЦРБ, 37 чал.

**10 мая**

Бібліятэкар Пескаўскай публічнай бібліятэкі арганізавала і правяла конкурс чытальнікаў ваеннай паэзіі «Захоўваючы памяць». Арганізавана выстава «Вайна вачыма дзяцей». У завяршэнні мерапрыемства каля абеліска вучні ўшанавалі памяць загінуўшых аднавяскоўцаў хвілінай маўчання.

Пескаўская ПБ, 19 чал.

**11 мая**

У ходзе цыкл мерапрыемстваў бібліятэкі прадстаўлены: відэаролік «Дзяржаўныя сімвалы - нацыянальны гонар», слайд-прэзентацыя «Сімвалы малой радзімы», праведзены бібліяграфічны агляд выстаўкі «Сімвалы патрыятызму, развіцця і духоўнай чысціні» з серыі «Святочныя даты нашай дзяржаўнасці». Вучні гімназіі г. Кобрына, падапечныя Кобрынскага ТЦСАН і

Кобрынскага псіханеўралагічнага дома-інтэрната для састарэлых і інвалідаў, пазнаёміліся з гісторыяй узнікнення сімвалаў нашай дзяржавы, сімволікай малой радзімы, даведаліся аб ролі і значэнні яе ў жыцці кожнага чалавека і краіны ў цэлым, адказалі на пытанні інтэрактыўнай віктарыны.

ЦРБ, 60 чал.

**13 мая**

У філіяле «Дзівінская публічная бібліятэка» прайшла інфармацыйная гадзіна «Сімвалы яднання і сувязі часоў». Вядучыя расказалі, як выглядаюць сімвалы беларускай дзяржаўнасці і што сімвалізуюць тыя ці іншыя элементы. Вучні адказвалі на пытанні віктарыны «Мой герб, мой сцяг, мая краіна». Аформлена кніжная выстаўка «Заўсёды квітней пад мірным небам, Беларусь!».

Філіял «Дзівінская публічная бібліятэка», 22 чал.

**<u>Мерапрыемствы да Міжнароднага дня сям’і</u>**

**13 мая**

У бібліятэцы падчас правядзення раённага этапа рэспубліканскага сямейнага сельскагаспадарчага праекта «Властелин села – 2023» і «Слёта молодых семей» для ўдзельнікаў прайшоў адзін з этапаў квэст-гульні «Семья и книга». Прымалі ўдзел сем'і: Бародкіны, Машлякевіч, Данілюк, Гапановіч, Сердзюк. Удзельнікі квэст-гульні адказвалі на пытанні віктарыны, узгадвалі назвы твораў па ілюстрацыях.

Філіял «Дзівінская публічная бібліятэка», 25 чал.

**14 мая**

Для маладых сем'яў Кобрына арганізавана конкурсная праграма ў форме квэста. Адной з пяці пляцовак з заданнямі стала станцыя «Семья и книга». Супрацоўнікі цэнтральнай раённай бібліятэкі падрыхтавалі шэраг пытанняў і заданняў. Квэст складаўся з 5 станцый: «Народная мудрость гласит», «Сказочная», «Книжные джунгли», «Вертолет», «Сыщики». Камісія вызначыла пераможцаў. Для наведвальнікаў парка прадстаўлена кніжна-ілюстраваная выстава «Семью сплотить сумеет мудрость книг».

ЦРБ, 33 чал.

**19 мая**

Тэматычны час «Моя семья – моя радость» прайшоў сумесна з падапечнымі аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў і грамадзян пажылога ўзросту Кобрынскага ТЦСАН. Супрацоўнікі бібліятэкі расказалі прысутным аб гісторыі ўзнікнення свята, галоўных сямейных каштоўнасцях, аб святых заступніках сям'і і шлюбу. Другім блокам стаў песенны. ад удзельнікамі клуба «Сустрэча» і вершаваны ад народнага аматарскага аб'яднання «Белы бусел».

ЦРБ, 38 чал.

**17 мая**

Для навучэнцаў ДУА «Гімназія г. Кобрына», УА «Кобрынскі дзяржаўны каледж сферы абслугоўвання» адбылася гадзіна прававых зносін

«Семейный кодекс счастья». Перад прысутнымі выступілі: загадчык юрыдычнай кансультацыі Кобрынскага раёна Брэсцкай абласной калегіі адвакатаў, адвакат, медыятар Алена Мінгазава, адвакат юрыдычнай кансультацыі Кобрынскага раёна Вольга Ішкініна, акушэр-гінеколаг жаночай кансультацыі філіяла «Радзільны дом» Таццяна Плеско. Бібліятэкары прадставілі відэаролік «Закон на страже семьи», правялі інфармацыйны агляд выставы «Семью сплотить сумеет мудрость книг», арганізавалі экскурс у ПЦПІ.

*(Кобрынскі веснік, 24 мая 2023 год).*

ЦРБ, 37 чал.

## Мерапрыемствы ў рамках Сусветнага дня без тытуню

**26 мая**

Бібліятэка правяла гадзіну разважанняў «Очень мрачная она – сигаретная страна». З дапамогай відэапрэзентацыі навучэнцы пазнаёміліся з гісторыяй з'яўлення тытуню, пра згубны ўплыў нікатыну, даведаліся, што такое «электронная цыгарэта», «вэйпы», «кальян», адказалі на пытанні віктарыны «Курить – здоровью вредить». Усім прысутным прапанаваны буклеты пра шкоду курэння.

Лукская ПБ, 17 чал.

**28 мая**

Падчас правядзення ўроку здароўя «Всем ясно – курение опасно» бібліятэкар азнаёміла ўдзельнікаў з гісторыяй з'яўлення тытуню і цыгарэт, прывяла гістарычныя даведкі пра шляхі распаўсюджванне тытуню па ўсім свеце, праінфармавала пра шкоду гэтай звычкі для ўсіх. Рассказ суправаджаўся паказам відэапрэзентацыі пра шкоду курэння «Курение - фактор риска».

Гарадзецкая ПБ, 12 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**23 мая**

Адбылася прэзентацыя новых кніг члена Міжнароднай асацыяцыі пісьменнікаў і публіцыстаў Надзеі Момлік, якая з’яўляецца актыўнай удзельніцай літаратурнага клуба «ПаэтыКо» і народнага аматарскага аб’яднання «Белы бусел». У гэтым годзе пабачылі свет яе кнігі «Святло Надзеі» (паэзія і проза) і «Ліст з мінулага» (пераклады на беларускую мову з рускай і ўкраінскай). Вяла мерарыемства член Саюза пісьменнікаў Беларусі, кіраўнік клуба «ПаэтыКо» Наталля Кандрашук. Аздобілі мерапрыемства песні на словы Надзеі Момлік у выкананні Таццяны Гурыш, Галіны Кузіч і Юрыя Харэвіча.

ЦРБ, 28 чал.

Исполнитель: Михейкина-Белякова Е.М.
Тел. 3 85 81